**Андрэй Бастунец: «Дзіўна і смешна, што пратаколы за парушэнне заканадаўства аб СМІ складаюць міліцыянты»**

*Намеснік старшыні ГА «БАЖ», юрыст **Андрэй Бастунец** каментуе хвалю адміністратыўных спраў супраць журналістаў, якія супрацоўнічаюць з замежнымі СМІ (красавік-май 2014 г.).*

**А. Бастунец:** "Не думаю, што гэта нейкім чынам звязана з хакейным чэмпіянатам. Бо праблемы ўзнікаюць не ў Мінску, дзе гэты чэмпіянат праходзіць, а ў іншых гарадах краіны. Гэта і выпадкі з **Аленай Сцяпанавай** і **Святланай Сцяпанавай** у Віцебску, з **Алесем Дзянісавым**, **Андрэем Мялешкам** і, верагодна, **Алесем Залеўскім** на Гродзеншчыне.

Не ведаю, у чым прычына такіх дзеянняў, ці каардынуюцца яны з нейкага цэнтру альбо з'яўляюцца недарэчнай "рэгіянальнай ініцыятывай".

Журналістаў звінавачваюць у парушэнні аднаго і таго ж артыкулу 22.9 ч.2 КаАП - "незаконны выраб і распаўсюд прадукцыі СМІ". І тут я бачу як мінімум дзве сур'ёзныя праблемы.

Першая – дастаткова дзіўна і смешна выглядае тое, што пратаколы за парушэнне заканадаўства аб СМІ складаюць міліцыянты. Большасць з якіх, я перакананы, гэтага закона і ў вочы не бачылі.

Другая праблема – незалежнасць нашых судоў пры разглядзе зваротаў міліцыі і веданне імі таго ж заканадаўства аб СМІ.

Я ўпэўнены, што ў выпадку з Дзянісавым (тут судовая пастанова ўжо ўступіла ў законную сілу) і суд першай інстанцыі, і касацыйная інстанцыя вынеслі рашэнні, не разабраўшыся ў тэрміналогіі закона і нават не ўзгадваючы пра Канстытуцыю. На жаль, яе нашы суды не разглядаюць як Асноўны Закон, пра што сведчыць хаця б поўная адсутнасць спробаў з боку судовай улады паставіць перад Канстытуцыйным судом пытанне пра адпаведнасць таго ці іншага прававога акта Канстытуцыі.

Праваахоўнікі і суды фактычна прыроўніваюць журналістаў да рэдакцый СМІ, звінавачваючы іх у "незаконным вырабе і распаўсюдзе прадукцыі СМІ". Але ж прадукцыю СМІ журналісты не вырабляюць! Прадукцыя – гэта наклад друкаванага выдання, тэле- альбо радыёпраграма цалкам і г.д. Паводле закона "Аб СМІ", журналісты рыхтуюць матэрыялы, паведамленні для СМІ, на аснове якіх рэдакцыі якраз і вырабляюць "прадукцыю СМІ". Прасцей кажучы,

прадукцыяй журналіста з’яўляецца артыкул, сюжэт, матэрыял, а вось ужо з іх рэдакцыя СМІ і робіць прадукцыю СМІ. Адпаведна, толькі рэдакцыя і можа быць прыцягнутая да адказнасці па гэтым артыкуле, а ніяк не журналіст.

Я яшчэ магу зразумець, што службовыя асобы ў міліцыі не ведаюць закона аб СМІ. І што не ўсе суды падрыхтаваныя да падобных спраў (а механізм выпраўлення памылак у выглядзе касацыі і нагляду ў Беларусі працуе ў межах статыстычнай памылкі). Але ж як патлумачыць тое, што органы, якія вядуць адміністратыўны працэс, не толькі памыляюцца ў прымяненні матэрыяльнага права, але ж ігнаруюць і працэсуальнае? А яго нормы мусяць і ў праваахоўнікаў, і ў судоў, як кажуць, ад зубоў адскокваць!

Напрыклад, у выпадку з Алесем Залеўскім, наколькі мне вядома, міліцыя нават не выклікала яго павесткай для складання пратакола. І не адаслала пратакол па пошце ў трохдзённы тэрмін, як таго патрабуе Працэсуальна-выканаўчы кодэкс аб адміністратыўных правапарушэннях. А суд, замест таго, каб указаць міліцыі на парушэнне і адправіць пратакол на дапрацоўку, прыняў яго да разгляду і сам працягнуў дзейнічаць у тым жа стылі: выклікаў Алеся не павесткай, а праз тэлефанаванне”.